# Да спосабаў мысьлі

Выразы „ў колькасьці“, „у якасьці“ паказваюць на колькасьць і якасьць як на абсягі быцьця, у якіх прабывае тая ці іншая данасьць.

Па–беларуску „колькасьцю“ і „якасьцю“ паказваюць на колькасьць і якасьць як: 1) на сторану ў праяўленьні данасьці, уласьцівую ёй пад'існую ёй і ў ёй і як: 2) на меру для данасьці паняцьцем, што ўзята з дасьведчаньня ўласьцівасьцяй рэчаў. Тут яны выступаюць не як быцьцё, у якім прабывае данасьць, а як дваякага роду яе ўласьцівасьці, даныя ў зьяве і вымераныя людзкім паняцьцем гэтых уласьцівасьцяй. Першыя выразы цалком об'ектывізуюць данасьць у гэтых абсягах быцьця. Другія, вызначаючы об'ектыўнае быцьцё ў данасьці, вымяраюць яго суб'ектыўным быцьцём разуменьня дасьведчанага ўжо з гэтага об'ектыўнага быцьця.

Два роды гэтых выразаў зьяўляюць сабою два роды ў спосабах мысьленьня. Першы мысьліць сьвет і ўсе яго данасьці прабываючымі ў быцьці, у розных яго станах, абсягах і момантах. Усё прабывае ў сваім быцьці, у сваёй існасьці і ў сваім паняцьці. Гэта як бы тры натуральныя станы ўсяго існага (так, прынамсі, мысьліць сьвет Гегел[еўская] філёзофія).

Другі мысьліць сьвет як ён ёсьць з усімі яго ўласьцівасьцямі ў дачыненьні да чалавека і яго паняцьцяў. Кожная данасьць для яго разлажыма на яе ўласьцівасьці і вызначаецца гэтымі паняцьцямі гэтых уласьцівасьцяй. Кожная данасьць вымяраецца паняцьцямі.

*[1931 — 1932]*